Дашкевіч А.Л., студ. гр. 150 ФІДК
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Бяспалая М.А.,
доктар гістарычных навук, прафесар

# АСНОЎНЫЯ СУПЯРЭЧНАСЦІ ГІСТОРЫІ ГРУНВАЛЬДСКАЙ БІТВЫ: ПАРАЎНАЎЧЫ АНАЛІЗ ПОЛЬСКІХ І ЛІТОЎСКІХ ЛЕТАПІСАЎ

Вялікае значэнне для нашай гісторыі мае дата 15 ліпеня 1410 года, калі адбылася бітва пад Грунвальдам, у якой пацярпеў паражэнне Тэўтонскі ордэн.

Агульнымі намаганнямі Польшча і Вялікае княства Літоўскае перамаглі заваёўнікаў і "прыйшоў час, і выбіты зубы іх і адсечана правая рука!", як вобразна пісаў Генрык Сянкевіч у рамане "Крыжакі" [1, 649]. Аднак, чытаючы летапісы, хронікі той даўніны, мы не сустракаем пэўнага адзінства ў раскрыцці падзей Грунвальдскай бітвы. Польскі бок паведамляе адно, літоўскі другое.

Прымаючы за аснову такія першакрыніцы, як "Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага", "Хроніка Быхаўца", а таксама "Гісторыя Польшчы" Яна Длугаша, - мы паспрабуем з дапамогай параўнальнага аналізу высветліць асноўныя супярэчнасці гісторыі Грунвальдскай бітвы, якія сустракаюцца ў польскіх і літоўскіх хроніках.

Грунвальдская бітва з'явілася кульмінацыяй вялікай вайны 1409 – 1410 гг. паміж Польшчай і Вялікім княтсвам Літоўскім з аднаго боку і Ордэнам з другога. У пачатку ліпеня 1410 года ваяры Вялікага княства сустрэліся з польскімі харугвамі каля Чэрвеньска на Віслe, а праз два тыдні адбылася бітва. Польскае войска прыйшло ў складзе 50 харугваў, 7 з іх выставілі падначаленыя Польскай кароне ўкраінскія землі.

Вялікае княства Літоўскае вывела на поле 40 харугваў. З 40 харугваў Вялікага княства Літоўскага Длугаш называе віленскую, трокскую, ковенскую, гродзенскую, віцебскую, полацкую, лідскую, наваградскую, валкавыскую,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

медніцкую, пінскую, брэсцкую, кіескую, старадубскую, драгічынскую, мельніцкую, крамянецкую, смаленскую, а яшчэ харугвы князёў Сігізмунда – Карыбута, Сямёна –Лінгвена Мсціслаўскага і нейкага Георгія (Юрыя). Астатнія 19 харугваў не ўпамянуты [2, 78]. Акрамя іх, з Вітаўтам прыбыла конніца хана Джэлаладдзіна. Ян Длугаш у “Гісторыі Польшчы” паведамляе, што толькі 300 татар удзейнічалі ў бітве. Даследчыкі лічаць што, гэтая лічба ў шмат разоў заніжана. Паводле паданняў беларуска - літоўскіх татар, пры вялікім князе Вітаўце іх рассялілася ў Вялікім княстве каля 40 тысяч. Зыходзячы з гэтага факта, адны лічаць, што у бітве прыняло ўдзел каля 30 тысяч татараў, другія сцвярджаюць, што 10 – 15 тысяч вершнікаў, некаторыя абмяжоўваюць іх колькасць да 1- 2 тысяч. Не маючы больш дакладных звестак, цяжка пагадзіцца з якой-небудзь із пералічаных думак, але магчыма канстатаваць, што татарскі хан далучыў да вялікакняжацкага войска не менш 5-ці тысяч вершнікаў [2, 78].

Маюцца прыкметныя разыходжанні і ў асвятленні непасрэдных падзей бітвы. Напрыклад Ян Длугаш паведамляе так: *“У гэтай бітве рускія Смаленскай зямлі ўпарта змагаліся, стоячы пад уласнымі трыма сцягамі… Хоць пад адным сцягам яны былі бязлітасна высечаны і харугва іхняя была ўтаптаная ў зямлю, аднак у двух астатніх харугвах яны выйшлі пераможцамі, бо біліся з вялікай храбрасцю, як належыць мужам і рыцарам, і нарэшце, злучыліся з польскімі войскамі…” [2, 80].* Такім чынам, словы Длугаша, што ў бітве выступалі тры смаленскія палкі, выклікаюць непаразуменне, бо, як мы адзначылі раней, гісторык называе смаленскі полк у адзіным ліку, а потым мы бачым, што ў тэксце ўзнікаюць тры палкі. Сам Смаленск выправіць цэлых тры палкі быў не здольны, не меў ён такой колькасці насельніцтва. Хутчэй за ўсё, размова ідзе не пра палкі аднаго Смаленска, а менавіта пра палкі Смаленскай зямлі (смаленская, аршанская і мсціслаўская харугвь) [2, 79].

Далей Длугаш піша: *“Абодва войскі, пасля таго як сышліся, змагаліся амаль на працягу гадзіны з неакрэсленым поспехам; і як ні тое, ні другое войска не*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*падавалася назад, з моцнай упартасцю дамагаючыся перамогі…. Крыжакі, прыкмеціўшы, што на левым крыле супраць польскага войска завязалася цяжкая і небяспечная схватка… звярнулі сілы на правае крыло, дзе стаяла літоўскае войска. Войска літоўцаў мела больш рэдкія шэрагі, горшых коней і зброю… Адкінуўшы літоўцаў, крыжакі меліся б мацней ударыць па польскаму войску… Літоўскае войска, не маючы сіл вытрымаць варожы націск, аказалася ў горшым становішчы… Вітаўт, вялікі князь літоўскі, вельмі сумуючы з – за ўцёкаў свайго войска… пасылаў аднаго за другім ганцоў да караля, каб той спяшаўся без усякай зацяжкі ў бой" [2, 83].*

Дадзены ўрывак Яна Длугаша стварае ўражанне, што ўцякала амаль усё вялікакняжацкае войска, акрамя трох палкоў смаленскай зямлі. Але пры ўважлівым аналізе можна заўважыць, што Вітаўт пасылаў ганцоў да караля, каб той паспяшаўся ўступаць у бой, нават сам прыскакаў.Хутчэй за ўсё, кароль Ягайла жадаў, каб у вялікага князя Вітаўта не засталася ў далейшым моцнай ваеннай апоры. Разгром, аб якім паведамляе Длугаш, вельмі цяжка ўявіць, таму што яго высновы супярэчаць рэальным фактам і умовам.

Звернемся зараз да літоўскіх крыніц, дзе некалькі іншы погляд на ход бітвы. "Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага" паведамляе так: "*… Потым вдарено в котлы, в сурмы и зараз литва з татарами з великою прудкостю скочили на немци и сточили з ними битву, же конь об коня боком отирался. Витолт и сам бегаючы, своих напоминает и шики поправует, поляци тож с кролем своим, припавши, взяли немцев на палаши… а потым видят немцы, же юж их много трупов лежит по полю, почали утекати, а поляки и литва з татарами гонили их, биючи, стреляючи, рубаючи, колючи на килка миль, а зацнейшых офицеров имали и вязали, самого мистра пруского Улрика простый драб ощепом пробив. В той войне не все наши билися, другий и шабли не добывал, бо было поле тесное. А Витолт татар з лихвою охочею пустил, бурячи Прусы огнем и мечем и незносный починили шкоды" [2, 85].*

Больш цікавага захавала хроніка Быхаўца: *"Потым, видячи, князь велики Витолт, што войска его много сильно побито, а ляхове им жадное*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*помочы вчынити не хотят, и князь велики Витолт прыбег до брата своего короля Ягайлы, а он мшу слухает. А он рек так: «Ты мшу слухаеш, а князи и панове, братя мои, мало не вси побиты лежат, а твои люди жадное помоцы им вчинити не хотят». И он ему поведал: «Милы брате, жадным обычаем иначей вчинити не могу, только мушу дослухати мшу», и казал гуфу своему коморному на ратунок потягнути, которы же гуф войску литовскому помоч притягнувши, и пошол з войски литовскими и немец наголову поразил, и самого мистра и всех куиторов его до смерти побили, и безчисленное множество немцев поимали и побили, а иные войска ляцкие ничого им не помогали, только на то смотрели» [2, 85-86].* У дадзеным урыўку аўтар хронікі Быхаўца адыходзіць ад праўды, калі з пачуцця патрыятызму абмяжоўвае ўдзел польскіх ваяроў у Грундвальскай бітве.

У 7 гадзін вечара 15 ліпеня 1410 года бітва пад Грунвальдам скончылася. Тэўтонскі ордэн быў разгромлены. Аднак Тэўтонскі ордэн існуе і ў нашы часы ў выглядзе арыстакратычнай царкоўна – дабрачыннай арганізацыі. А як вайсковая дзяржава гэты ордэн хутка знік. Штогод 15 ліпеня на Грунвальдскім полі традыцыйна праходзіць фестываль і рэканструкцыя бітвы. У Беларусі таксама будуць святкаваць 600-годдзе Грунвальда. Так, выдавецтва “Рыфтур” і фонд “Краіна замкаў” прапануюць усім, каму неабыякава гісторыя нашага краю, адправіцца шляхам, які 600 год назад праходзілі воіны.

Літаратура:

1. Сянкевіч Г. Крыжакі: Раман. – Мн.: Маст. літ., 1983. – 654с.

2. Тарасаў К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны/Маст. А. У. Александровіч і інш. – 2-е выд., дап. – Мн.: Полымя, 1993. – 270 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ